МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
**«АКАДЕМИЯ ПОСЛЕДИПЛОМНОГО ОБРАЗОВАНИЯ»**

ОБЩЕСТВЕННОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ
**«БЕЛОРУССКОЕ ПЕДАГОГИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО»**

# Эффективный педагогический опыт: от теории к практике

## Республиканская конференция

19 ноября



Минск
2019

УДК 37.018.4(086)
ББК 74.00
Э 94

Председатель редакционного совета *Г. И. Николаенко,* проректор по научно-методической работе государственного учреждения образования «Академия последипломного образования», председатель общественного объединения «Белорусское педагогическое общество», доктор педагогических наук, доцент

**Э 94** **Эффективный** педагогический опыт : от теории к практике [Электронный ресурс] : респ. конференция (Минск, 19 ноября 2019 г.) / М-во образования Респ. Беларусь, ГУО «Акад. последиплом. образования», ОО «Белорус. пед. о-во». – Минск : АПО, 2019. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – Систем. требования : IBM- совместимый компьютер, ОЗУ 512 МБ, CD-ROM, экран 1024x768, Windows XP/Vista/7/8/10, Adobe Reader.

ISBN 978-985-495-475-2.

В сборнике представлены статьи участников республиканской конференции «Эффективный педагогический опыт: от теории к практике», организованной Министерством образования Республики Беларусь, государственным учреждением образования «Академия последипломного образования», общественным объединением «Белорусское педагогическое общество».

В материалах сборника содержится опыт педагогической деятельности по совершенствованию образовательного процесса посредством использования современных технологий, методик, авторских систем и учебно-методических разработок. Материалы авторов построены на основе анализа индивидуального педагогического опыта, способствующего развитию профессиональной компетентности педагога.

Адресуется педагогическим работникам системы дополнительного образования взрослых, учреждений образования (дошкольного, общего среднего, высшего, специального образования, дополнительного образования детей и молодежи).

**УДК 37.018.4(086)**
**ББК 74.00**

**ISBN 978-985-495-475-2**

© ГУО «Академия последипломного образования», 2019

..

# ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НА ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАХ ПА ПРАДМЕЦЕ «ЧАЛАВЕК І СВЕТ» І Ў ПАЗАЎРОЧНАЙ ПРАЦЫ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

Базар Н.М.,
настаўнік пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі "Каладнянскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад – базавая школа" Столінскага раёна

Даследчая дзейнасць вучняў – адзін са сродкаў рэалізацыі асобы ў агульнаадукацыйнай прасторы. Элементы даследчай дзейнасці, якая грунтуецца на прынцыпах развіваючага навучання, дазваляюць зрабіць урок па любым вучэбным прадмеце ў пачатковых класах урокам адкрыцця і ўзбагачэння ведаў, выклікаюць у дзяцей пазнавальны інтарэс, які з'яўляецца найбольш каштоўным матывам вучэбнай дзейнасці малодшага школьніка. Пазнанне адбываецца ў працэсе даследавання вучэбнага матэрыялу як на ўроках, так і ў пазаўрочнай працы. Выкарыстанне даследчай дзейнасці ў сістэме работы настаўніка з малодшымі школьнікамі, у тым ліку і праз сучасныя тэхналогіі дыстанцыйнага навучання, садзейнічае павышэнню ўзроўню развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў, што ў сваю чаргу спрыяе трываламу засваенню дзецьмі новых ведаў і паспяховаму засваенню зместу вучэбнай праграмы пачатковай школы.

Тэрмін "актыўнасць" адны вучоныя атаясамліваюць з дзейнасцю, другія лічаць яе вынікам дзейнасці, іншыя ўпэўнены, што "актыўнасць" – больш шырокае паняцце, чым дзейнасць. Вывучэннем розных аспектаў праблемы пазнавальнай актыўнасці вучняў займаліся і займаюцца многія даследчыкі: Б. Ананьеў, Д. Багаяўленская, Т. Зубкова, Г. Шчукіна, І. Якіманская і інш. Так, Т. Шамава разглядае пазнавальную актыўнасць як "качество личности" [7, с. 37], Г. Шчукіна – як "интеграцию поисковой направленности в учении, познавательного интереса и его удовлетворения при помощи различных источников знаний, благоприятных условий осуществления деятельности" [8, с. 80]. А. Сарока адзначае, што "познавательная активность выступает как сложное психическое новообразование, формируемое под влиянием разнородных, динамичных факторов" [6, с. 73]. Навукоўца падкрэслівае, што развіццё пазнавальнай актыўнасці працякае ў дзейнасным і асабістым планах.

Такім чынам, асноўныя характарыстыкі пазнавальнай актыўнасці вучня – імкненне да пазнання, станоўчыя адносіны да вучобы, актыўная пазнавальная дзейнасць, накіраваная на дасягненне значымага выніку. Паколькі ў малодшым школьным узросце настаўнік кіруе працэсам развіцця пазнавальнай актыўнасці, то асноўнай метадычнай мэтай дадзенага вопыту з'явілася стварэнне ўмоў для развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў праз уключэнне іх у даследчую дзейнасць.

Тэарэтычныя падыходы да выкарыстання даследчага метаду, як асновы развіваючага навучання ў пачатковай школе, прадстаўлены ў працах

А. Савенкава [5], ён жа прапанаваў паслядоўнасць дзеянняў пры выкананні вучнямі даследаванняў. Так, Д. Эльконіным [9] даказана, што ў вучэбнай дзейнасці найбольш поўна праяўляюцца арыгінальнасць мыслення і творчасць школьнікаў. Асаблівасць даследавання ў галіне адукацыі тое, што яно – вучэбнае. Канкрэтна размежаваў вучэбна-даследчую і навукова-даследчую дзейнасць вучняў М. Запрудскі [2]. У якасці метадалогіі псіхолага-педагагічнага суправаджэння даследчай дзейнасці вучня выкарыстоўваюцца асновы, прапанаваныя Н. Пахомавай [4].

Даследчая дзейнасць навучэнцаў – дзейнасць, звязаная з рашэннем вучнямі творчай і адначасова даследчай задачы з загадзя невядомым вынікам, і якая прадугледжвае наяўнасць асноўных этапаў, характэрных для даследавання ў навуковай сферы. Гэта пастаноўка праблемы, вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу, падбор методык даследавання і практычнае авалоданне імі, збор асабістага матэрыялу, яго аналіз і абагульненне, навуковы каментарый, уласныя вывады. На ўласнай педагагічнай практыцы ўпэўнілася, што даследчая дзейнасць спрыяе развіццю творчага патэнцыялу, пазнавальнай актыўнасці, вучэбнай матывацыі, садзейнічае актуалізацыі і паглыбленню ведаў вучняў па вучэбных прадметах. Дзякуючы павышэнню ўзроўню развіцця пазнавальнай актыўнасці асобы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, закладваюцца асновы вучэбных навыкаў, якія ў далейшым становяцца асноўнай умовай непарыўнай адукацыі. Ролю настаўніка ў выкарыстанні даследчай дзейнасці бачу ў стварэнні ўмоў для развіцця і падтрымкі пазнавальнай актыўнасці вучняў, для матывацыі іх на далейшую працу па авалоданню і трываламу засваенню новых ведаў, ва ўцягненні ў актыўную вучэбную і даследчую дзейнасць у пазаўрочны час.

Вопыт работы з малодшымі школьнікамі даў магчымасць прааналізаваць выкарыстанне даследчай дзейнасці ў пачатковых класах. У выніку быў распрацаваны і ўкаранёны ва ўласнай педагагічнай працы сістэмны падыход да стварэння ўмоў па павышэнню ўзроўню развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў праз даследчую (а менавіта вучэбна-даследчую) дзейнасць на ўроках па прадмеце “Чалавек і свет” і ў пазаўрочны час, у тым ліку і з выкарыстаннем сучасных тэхналогій дыстанцыйнага навучання (спачатку праз сацыяльную сетку “ВКонтакте”, а пазней і платформу “Moodle”). Вынікае, што ўмелае выкарыстанне магчымасцей даследчай дзейнасці ў працы з вучнямі дапамагае настаўніку не толькі выклікаць і падтрымаць у іх цікавасць да вывучаемага, а, што вельмі важна, дапамагае лепш засвоіць складаны праграмны матэрыял.

Прааналізаваўшы вынікі педагагічных даследаванняў вучоных па арганізацыі даследчай дзейнасці, а таксама свой вопыт у гэтым накірунку, лічу мэтазгодным вучэбна-даследчую дзейнасць у рабоце з вучнямі дзяліць на тры этапы і арганізоўваць яе ў адпаведнасці з імі: падрыхтоўчы этап – 1 клас (даецца агульнае ўяўленне аб паняццях), пераходны – 2 клас (вучні атрымліваюць новыя веды аб асаблівасцях даследчай дзейнасці), даследчы – 3-4 класы (вучэбна-даследчыя задачы становяцца больш складанымі, дзеці праводзяць як з дапамогай настаўніка, так і самастойна даследаванні па розных тэмах). Вучэбна-даследчую дзейнасць малодшых школьнікаў арганізую на

ўроках і ў пазаўрочны час. На ўроках разглядаю яе ў двух аспектах: урок з элементамі даследавання і нетрадыцыйныя ўрокі з выкарыстаннем даследчага метаду навучання (урок-даследаванне, урок-падарожжа, урок-праект, урок-творчая майстэрня).

Так, у ход урокаў у 1 класе ўключаю заданні, якія дазваляюць актывізаваць даследчую дзейнасць вучняў, арганізую трэніровачныя заняткі ў пазаўрочны час для знаёмства кожнага дзіцяці з паслядоўнасцю правядзення даследавання. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы аб раслінах прапаную вучням скласці невялікі аповед пра чароўную лекавую расліну. Дзеці пазнаюць, дзе і як можна атрымаць звесткі аб аб’екце даследавання (спытаць у настаўніка, у бацькоў, знайсці ў кнізе, у Інтэрнэце, у бібліятэцы і г.д.). Пры гэтым самым важным з’яўляецца навучанне малодшага школьніка задаваць пытанні. Тут жа высвятляецца і паслядоўнасць выканання задання, і тое, што для гэтага неабходна многа запісаў. Улічваючы ўзрост вучняў, робім выснову, што лепш за ўсё намаляваць расліну і расказаць пра тое, як яна можа дапамагчы ў лячэнні.

У 2 класе важна павялічваць веды вучняў пра даследчую дзейнасць, больш увагі звяртаць развіццю ўменняў вызначаць тэму даследавання, аналізаваць, фармуляваць гіпотэзы, рабіць вывады, афармляць іх пісьмова. Гэта ўсё адпрацоўваецца ў час экскурсій, назіранняў, міні-даследаванняў, пры правядзенні вопытаў, эксперыментаў. Добрае практыкаванне – складанне загадак, задач, сачыненняў.

У 3-4 класах вучні самі выбіраюць тэму даследавання, фармулююць гіпотэзы, шукаюць неабходны матэрыял (выпрацоўваецца ўменне карыстацца энцыклапедыямі, даведнікамі, кнігамі агульнаразвіццёвага характару), адбіраюць звесткі з вялікага аб’ёму інфармацыі, выказваюць свае думкі і ідэі, фармулююць простыя вывады на падставе двух-трох вопытаў, самастойна рашаюць творчыя задачы і ўскладняюць іх, пераходзячы свабодна ад прыватнага да агульнага.

Сучасная арганізацыя ўрока дазваляе выкарыстоўваць даследчы метад у навучанні на розных узроставых этапах. Пры арганізацыі такой дзейнасці на ўроку “Чалавек і свет” асабліваю ўвагу важна надаць пастаноўцы праблемы, арганізацыі дыялогу, пошуку рашэння ці ўключэння ва ўрок заданняў, якія маюць пошукавы характар. У залежнасці ад тэмы і тыпу ўрока даследчую дзейнасць ці яе элементы можна выкарыстоўваць на розных этапах урока. Так, на ўроку з элементамі даследавання мэтазгодным будзе выкарыстанне метадаў і прыёмаў, якія валодаюць найбольшым развіццёвым патэнцыялам. Напрыклад, на ўроку ў 2 класе па тэме “Умовы, неабходныя для росту і развіцця раслін”, важна стварыць умовы для падрыхтоўкі і правядзення доследу з прарошчваннем насення фасолі. Назіранне за тым, як вырастае з семя і развіваецца расліна, выходзіць за межы ўрока і працягваецца некалькі тыдняў. Вучні робяць уласныя высновы аб росце і развіцці фасолі, якія затым накіроўваюць іх да самастойных даследаванняў за працэсам росту і развіцця іншых раслін, што ўжо выходзіць за межы вучэбнай праграмы. У 4 класе на трэцім уроку па тэме “Адкуль пайшлі назвы нашых гарадоў” магчыма заданне “Ствараю герб вёскі Калоднае”, калі настаўнік прапануе стварыць герб роднай

вёскі, якога яна не мае. Для гэтага неабходна ўзгадаць гісторыю Калоднага, вызначыць, як можа выглядаць герб, што будзе на ім адлюстравана, якія сімвалы мэтазгодна пазначыць, якія колеры выкарыстаць.

Важнымі момантамі даследчай дзейнасці з’яўляецца выпрацоўка вучнямі рэкамендацый “Залатыя правілы харчавання” для дзяцей і дарослых на ўроку ў 3 класе па тэме “Азбука здаровага харчавання”, стварэнне газеты ў час працы рэдакцыйнай майстэрні на ўроку ў 4 класе па тэме “Нашы продкі”, калі вучні, акрамя асноўнага вучэбнага матэрыялу, знаёмяцца з журналісцкімі прафесіямі і з жанрамі журналістыкі, ствараюць журналісцкія матэрыялы. Станоўчыя вынікі дае правядзенне на ўроку міні-даследаванняў.

Добрая матывацыя на даследчую дзейнасць у пазаўрочны час адбываецца на ўроку ў 2 класе па тэме “Сям’я”, калі пасля агучвання дзецьмі заняткаў членаў сям’і, а таксама прафесій бацькоў, вучням прапануецца падрыхтаваць дома кароткія паведамленні пра прафесію каго-небудзь з бацькоў, бабуль ці дзядуль.

Даследчы метад навучання дазваляюць выкарыстоўваць нетрадыцыйныя ўрокі: урок-даследаванне, урок-падарожжа, урок-праект, урок-творчая майстэрня і інш. Калі гаварыць пра ўрок-даследаванне, адзначу, што такі ўрок лепш праводзіць тады, калі гэта дазваляе вывучаемы матэрыял, і тады, калі настаўнік адчувае гатоўнасць вучняў да гэтага, бачыць іх жаданне і магчымасці да адкрыцця новага. На ўроку-даследаванні спярша пад кіраўніцтвам настаўніка, а потым і самастойна дзеці вучацца шукаць праблемы і вырашаць іх. Пры вывучэнні ў 2 класе тэмы “Насякомыя (матылі)” дзецям спачатку задаецца пытанне-загадка, а потым з іх дапамогай агучваецца тэма, фармулюецца мэта, задачы ўрока: “Адгадайце загадку: Якія каляровыя кветкі ўмеюць лятаць? *(Адказы.)* На ўроку бліжэй пазнаёмімся з матылямі: даведаемся, якія характарыстыкі ўласцівы ім, якое значэнне матылі займаюць у прыродзе”. На такім уроку дзеці вучацца шукаць праблемы і вырашаць іх. Тэарэтычныя асновы з’яў і фактаў, удакладненне сувязей, выяўленне прыкмет, даследаванне спосабаў разважання і многае іншае можна разглядаць на такіх уроках.

Урок-даследаванне можа ўключаць у сябе актуалізацыю папярэдніх ведаў, узнікненне інтэлектуальнай цяжкасці, асэнсаванне праблемы вучнем і яе славеснае афармленне, праверку гіпотэз, дыскусію, абгрунтаванне, выкарыстанне атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці, абагульненне і вывады даследавання. Напрыклад, у 4 класе на ўроку вывучэння новага матэрыялу па тэме “Ад батлейкі – да паланэза” праз уступную гутарку настаўнік дапамагае вучням сфармуляваць тэму ці пытанне для тэарэтычнага даследавання гісторыі тэатра на беларускіх землях. Далей важна падвесці дзяцей да адкрыцця новых ведаў, імкнучыся да таго, каб яны зразумелі новы вучэбны матэрыял. Паведамленне аб даследаванні, якое адбудзецца на ўроку, можна рабіць і ў час паведамлення тэмы і мэты ўрока. Пры падвядзенні вынікаў абавязкова патрэбна зрабіць паўтарэнне і абагульненне ўсяго, што вучні даведаліся на ўроку. На такіх уроках дзеці вучацца шукаць праблемы і рашаць іх, тут разглядаюцца тэарэтычныя асновы з’яў і фактаў, адбываецца

ўдакладненне сувязей, выяўленне прыкмет, даследаванне спосабаў разважання і г.д.

Фарміраванню даследчых уменняў вучняў спрыяе пазаўрочная дзейнасць. Стымулюючыя заняткі прадугледжваюць паглыбленае вывучэнне прадмета і даюць вялікія магчымасці для рэалізацыі на іх вучэбна-даследчай дзейнасці. У пазаўрочнай дзейнасці работу з вучнямі варта арганізоўваць па трох накірунках: індывідуальная, групавая і калектыўная праца. Увагу пры гэтым важна канцэнтрваць на выбары тэмы даследавання, вызначэнні мэт, пошуку інфармацыі, на падрыхтоўцы да абароны і непасрэдна на абароне. На стымулюючым занятку па фарміраванні даследчых навыкаў малодшых школьнікаў па прадмеце “Чалавек і свет” у 3 класе “Марочна” дзеці вучацца вызначаць агульныя і ўласныя прыкметы праз параўнанне жывёл, што насяляюць балота, а затым самастойна складаюць загадкі пра іх на падставе агульных і ўласных прыкмет. Працуючы з тэкстам “Марочна”, малодшыя школьнікі вучыцца выдзяляць галоўную ідэю і другасныя факты ў тэксце. Вучні самастойна ці з дапамогай настаўніка вызначаюць галоўнае ў тэксце: заказнік “Марочна” знаходзіцца пад асобай аховай дзяржавы. Далей высвятляецца, чаму гэта так, якія факты ўдакладняюць дадзенае меркаванне. Для гэтага вядзецца работа па знаходжанні дадатковай інфармацыі: від балота – верхавое, называецца месца размяшчэння балота і яго плошча; гаворыцца пра расліны і жывёлы балота, акцэнт робіцца на тым, што сярод іх ёсць занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь; асобнае месца адводзіцца журавінам. Пасля такой грунтоўнай працы з тэкстам вучні паступова падыходзяць да вызначэння накірунку ці магчымай тэмы для будучага даследавання.

На інтэграваным стымулюючым занятку па матэматыцы і прадмеце “Чалавек і свет” у 3 класе “Сем цудаў Століншчыны” тэма, мэта і задачы паведамляюцца наступным чынам: “У свеце вядомы сем цудаў. *(Паказ карцінак кожнага з цудаў свету.)* Усе гэтыя цуды – шэдэўры прыроды і рук чалавека. На нашай роднай Століншчыне ёсць таксама цуды, а вось што гэта за цуды, вы даведаецеся падчас занятку. Скажу толькі, што іх будзе таксама сем. Знаёмячыся з цудамі Столінскага раёна, мы замацуем веды табліцы множання ліку 7 і на лік 7, навучымся прымяняць іх на практыцы і складзем праект, які так і назавём: “Сем цудаў Століншчыны”.

Для індывідуальнай даследчай працы і часткова групавой мэтазгодна выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі дыстанцыйнага навучання. На старонцы групы “ДО для детей” (адрас старонкі https://vk.com/club138180380) у сацыяльнай сетцы “ВКонтакте” размяшчаю заданні для дзяцей, цікавую інфармацыю, спасылкі на Інтэрнэт-крыніцы, матэрыяламі якіх вучні карыстаюцца пры правядзенні даследаванняў. Вучні далучаюць файлы з сабранымі звесткамі, якія правяраюцца настаўнікам, тут жа дзеці атрымліваюць рэкамендацыі. У абмеркаваннях вучні задаюць пытанні, абменьваюцца сваімі думкамі. У выкарыстанні магчымасцей групы ў сацыяльнай сетцы дапамагаюць бацькі вучняў, асабліва іх дапамога была патрэбна ў рэгістрацыі ў сацсетцы і ў тэхнічным боку ў пачатку такой працы.

На платформе “Moodle” аўтарам матэрыялу распрацавана дыстанцыйнае суправаджэнне па прадмеце “Чалавек і свет” для 4 класа (адрас: https://moodle.boiro.by/course/view.php?id=49), якое выкарыстоўваю ў тым ліку і з мэтай павышэння ўзроўню развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў. Так, у курсе змешчаны дадатковыя звесткі да матэрыялу падручніка (апавяданні, лекцыі, кнігі, рубрыкі “Цікава ведаць”), заданні, тэсты, апытанкі, гульні, інфаграфіка, відэазапісы і многае іншае. Уключаны ў курс заданні, створаныя пры дапамозе сэрвісаў Web 2.0.

Павышаны ўзровень пазнавальнай актыўнасці вучняў і паказчыкі выніковасці засваення праграмнага матэрыялу па прадмеце “Чалавек і свет” пацвярджаюць правільнасць выкарыстання настаўнікам даследчай дзейнасці на вучэбных занятках па прадмеце і ў пазаўрочнай працы як сродку развіцця пазнавальнай актыўнасці малодшых школьнікаў. Крытэрыі выніковасці: узровень развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў, якасць ведаў па прадмеце “Чалавек і свет”, вынікі ўдзелу ў даследчых канферэнцыях і конкурсах раённага і абласнога ўзроўняў.

Для высвятлення эфектыўнасці выкарыстання даследчай дзейнасці на вучэбных занятках па прадмеце “Чалавек і свет” і ў пазаўрочны час як сродку развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў, была вызначана ступень выяўленасці пазнавальнай актыўнасці вучняў (методыка Г. Гарчынскай) і ўзровень пазнавальнай актыўнасці вучняў (апытальнік Ч. Спілберга) на пачатковым і заключным этапах. Кожная дыягностыка праведзена двойчы з вучнямі 2 і 4 класаў у 2010 годзе і ў 2013 годзе, у 2014 годзе і ў 2017 годзе. Вынікі праведзеных дыягнастычных даследаванняў сведчаць, што, дзякуючы даследчай дзейнасці, колькасць вучняў з умеранай і слаба выражанай пазнавальнай актыўнасцю паменшылася, а колькасць з моцна выражанай – узрасла (Табліца 1).

**Табліца 1 – Ступень выяўленасці пазнавальнай актыўнасці (% ад вучняў класа)**

| | Кастрычнік, 2010 год (2 клас) | Май, 2013 год (4 клас) | Кастрычнік, 2014 год (2 клас) | Май, 2017 год (4 клас) |
|---|---|---|---|---|
| Слаба выражаная | 50% | 17% | 50% | 25% |
| Умераная | 33% | 17% | 50% | 25% |
| Моцна выражаная | 17% | 66% | 0% | 50% |

У 4 класе, у параўнанні з 2 класам, паменшылася колькасць вучняў з нізкім узроўнем пазнавальнай актыўнасці, значна павялічылася колькасць вучняў з высокім узроўнем пазнавальнай актыўнасці.

Вынікі вучэбных дасягненняў вучняў па прадмеце “Чалавек і свет” паказалі, што вучэбны матэрыял засвоены, а праведзены аналіз якасці ведаў па прадмеце “Чалавек і свет” вучняў 3-4 класаў (у канцы 3 класа і ў канцы 4 класа) сведчыць аб станоўчай дынаміцы якасці навучанасці па прадмеце (Табліца 2).

**Табліца 2 – Параўнальны аналіз узроўню якасці ведаў вучняў 3-4 класаў**

| Узровень навучанасці | 2011/2012 навучальны год (3 клас) | 2012/2013 навучальны год (4 клас) | 2015/2016 навучальны год (3 клас) | 2016/2017 навучальны год (4 клас) |
|---|---|---|---|---|
| | (% ад агульнай колькасці вучняў у класе) | | | |
| Высокі ўзровень (9-10 балаў) | | 50% | | 50% |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Дастатковы ўзровень (7-8 балаў) | 66% | 33% | 75% | 25% |
| Сярэдні ўзровень (5-6 балаў) | 17% | 17% | 25% | 25% |
| Здавальняючы ўзровень (3-4 балы) | 17% | | | |
| Нізкі ўзровень (1-2 балы) | | | | |

Выніковасць і эфектыўнасць вопыту па выкарыстанню даследчай дзейнасці ў навучанні і выхаванні вучняў можна прасачыць не толькі па выніках іх вучэбных дасягненняў, але і па выніках удзелу малодшых школьнікаў у навукова-практычных канферэнцыях, даследчых і інтэлектуальных конкурсах рознага ўзроўню. Дыпломамі І ступені на раённых канферэнцыях даследчых работ і праектаў малодшых школьнікаў "Я – даследчык" адзначаны эксперыментальна-тэарэтычная работа "Палескае золата" (А. Пашкевіч, 2012 год), эксперыментальна-тэарэтычная работа "І цяпер патрэбен кошык" (М. Леська, 2013 год), даследчая работа "Палескае акно: сакрэты і перспектывы" (Г. Рабатаж, 2017 год), дыпломам ІІІ ступені – эксперыментальна-тэарэтычная работа "Дрэвы. Роля драўніны ў жыцці чалавека" (на прыкладзе лясных угоддзяў Каладнянскага лясніцтва) (А. Рахманько, 2011 год). Па выніках абласной навукова-практычнай канферэнцыі "З навукай у будучыню" эксперыментальна-тэарэтычная работа "Палескае золата" (А. Пашкевіч, 2013 год) адзначана дыпломам ІІІ ступені, а даследчая работа "Палескае акно: сакрэты і перспектывы" (Г. Рабатаж, 2017 год) – дыпломам ІІ ступені.

Такім чынам, сістэмна арганізаваная даследчая дзейнасць спрыяе павышэнню ўзроўню развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў, а выкарыстанне магчымасцей сацыяльных сетак у Інтэрнэце і сучасных тэхналогій дыстанцыйнага навучання дазваляюць зрабіць яе працэсам пастаяннага адкрыцця і ўзбагачэння ведаў.

Дзякуючы атрыманым вынікам зроблены высновы, што даследчая дзейнасць: 1) накіравана на пошук вучнямі новых паняццяў і спосабаў дзеянняў спачатку пад кіраўніцтвам настаўніка, а затым і самастойна, спрыяе таксама развіццю інтэлектуальнай творчай ініцыятывы; 2) прадугледжвае паслядоўную і мэтанакіраваную пастаноўку перад вучнямі пазнавальных праблем, рашэнне якіх прыводзіць да актыўнага засваення ведаў; 3) забяспечвае асобы спосаб мыслення, трываласць ведаў і іх творчае прымяненне ў практычнай дзейнасці.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Вадневская, И. А. Исследовательская деятельность как средство развития младших школьников / И. А. Вадневская // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2011. – № 1. – С. 6-8.

2. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии-2 / Н. И. Запрудский. – Минск : Сэр-Вит, 2010. – 288 с.

3. Островская, А. А. Практика и мониторинг в исследовательской деятельности учащихся младших классов / А. А. Островская // Пачатковае навучанне : сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2017. – № 3. – С. 54-60.

4. Пахомова, Н. Ю. Метод учебного проекта в образовательном учреждении : пособ. для учит. и студ. вузов / Н. Ю. Пахомова. – М. : АРКТИ, 2005. – 112 с.

5. Савенков, А. И. Методика исследовательского обучения младших школьников / А. И. Савенков. – Самара : Учебная литература, 2006. – 208 с.

6. Сорока, О. Г. Рекомендации по обобщению опыта по проблемам организации познавательной деятельности учащихся / О. Г. Сорока // Пачатковае навучанне : сям’я, дзіцячы сад, школа (школа пед. маст.). – 2015. – № 8 (12). – С. 53-79.

7. Шамова, Т. И. Активизация учения школьников. – М. : Педагогика, 1982. – 209 с.

8. Щукина, Г. И. Педагогические проблемы формирования познавательного интереса учащихся / Г. И. Щукина. – М. : Просвещение, 1988. – 153 с.

9. Эльконин, Д. Б. Детская психология : учеб. пос. для студ. высш. учеб. заведений / Д. Б. Эльконин. – М. : Изд. центр «Академия», 2007. – 384 с.

10. Якиманская, И. С. Знания и мышление школьника / И. С. Якиманская. – М. : Знание, 1985. – 80 с.

СОДЕРЖАНИЕ

**Александрова И.А.** Использование интерактивных методов и приемов в процессе обучения русскому языку для формирования дивергентного мышления учащихся ... 3

**Алексеева А.В.** Формирование и развитие навыков решения расчетных задач по учебному предмету «Химия» ... 11

**Аленькова С.В.** Игровые технологии на уроках французского языка на начальном этапе обучения ... 20

**Алисеева Л.М.** Виды учебных исследований учащихся и способы вовлечения их в творческую деятельность в рамках работы НОУ ... 26

**Артёмова Е.В.** Применение медиакомпетентностного подхода на занятиях по учебному предмету «Информатика» как фактор повышения качества образования ... 33

**Асадчая Е.А., Юрченко И.И.** Система работы по формированию социальной успешности учащихся через конструирование роботов и программирование их действий ... 36

**Атрахимович И.И.** Об организации исследовательской деятельности учащихся в средней школе ... 41

**Афанасенко А.В.** Использование эффективных образовательных приемов на уроках биологии как средство развития учебно-познавательной компетенции учащихся ... 44

**Базар Н.М.** Даследчая дзейнасць на вучэбных занятках па прадмеце «Чалавек і свет» і ў пазаўрочнай працы як сродак развіцця пазнавальнай актыўнасці малодшых школьнікаў ... 47

**Байдюк А.А.** Развитие умений, необходимых для освоения обязанностей защитника отечества, учащимися на уроках допризывной подготовки посредством использования интеллект-карт ... 55

**Бебех В.А.** Использование мобильных технологий на учебных и факультативных занятиях для повышения мотивации учащихся ... 60

**Бегларян С.Н.** Активизация познавательной деятельности учащихся посредствам использования проектных задач ... 67

**Безносова Т.Н.** Социализация учащихся через формирование социально-трудовых компетенций ... 71

**Бялецкая В.Ф.** Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі праз выкарыстанне прыёмаў праблемнага навучання ... 76

**Белозарович Н.Н.** Международные интернет-проекты как средство повышения мотивации к изучению английского языка на II ступени общего среднего образования ... 82

**Белостоцкая Е.А.** Профилактика буллинга в классных коллективах ............... 90

**Беляк С.П.** Роль исследовательской деятельности в повышении эффективности изучения английского языка ............... 98

**Березнёва О.Н.** Включение энерго- и ресурсосберегающего аспекта в урок математики как средство формирования культуры энергоресурсопотребления учащихся ............... 103

**Бітчанка С.М.** Прынцыпы арганізацыі вучэбнага матэрыяла пры стварэнні падручнікаў гісторыі для ўстаноў пачатковай і сярэдняй адукацыі Расійскай імперыі ў канцы XIX – пачатку XX стст. ............... 109

**Бобр Е. В.** Сетевое сообщество как эффективный инструмент педагогического взаимодействия ............... 119

**Бондаренко Е.В., Лобкова С.С.** Сетевой проект как средство расширения образовательной среды на і ступени общего среднего образования ............... 122

**Букато О.Н.** Использование активных методов и приёмов обучения на уроках истории как средства формирования исследовательских компетенций ............... 128

**Булай И.Б., Капуста Е.П.** Использование сетевого взаимодействия для развития иноязычной коммуникативной компетенции учащихся на II и III ступенях общего среднего образования ............... 135

**Булай И.Б., Капуста Е.П.** Поликультурное развитие учащихся в контексте современных образовательных тенденций ............... 140

**Бурачевская О.Л.** Формирование метапредметных результатов учебной деятельности на уроках и во внеурочных занятиях по истории и обществоведению как фактор формирования методологической культуры учащихся ............... 143

**Бусько А.В.** Учебное занятие по информатике, его особенности и эффективность ............... 151

**Вавренчук Н.А.** Спецкурс «Формирование математической речи у младших школьников» как организационно-методический компонент профессиональной подготовки педагогов ............... 157

**Власюк Т.А.** Развитие профессиональной компетентности современного учителя ............... 161

**Внук Л.Б.** Использование метода проекта в поликультурном образовании детей дошкольного возраста ............... 165

**Войтехович Е.В.** Роль целеполагания и критериев оценивания в повышении эффективности усвоения учащимися VI класса материала при изучении темы «Имя существительное» на уроках русского языка ............... 169

**Делендо Т.М., Войтович И.Ю.** Педагогическая поддержка детей, воспитанников детских домов семейного типа ............... 177

**Войтович Т.С.**Организация методической работы по сопровождению эффективного педагогического опыта ... 183

**Воронина Л.А.** Использование тестовых сред для осуществления текущего контроля знаний учащихся ... 187

**Вязгина В.И.** Методика обобщения и описания опыта в сфере воспитательной работы ... 192

**Гавриленко И.В.** Эстетическое воспитание учащихся посредством организации досуговых event-мероприятий ... 199

**Ганина М.В.** Система работы учителя трудового обучения по развитию творческих способностей учащихся на уроках и во внеурочной деятельности ... 202

**Ганич Е.В.** Состояние проблемы дифференцированного подхода к развитию речи детей дошкольного возраста в теории и практике дошкольного образования ... 212

**Гарбар Е.Е.** Авторское учебно-методическое обеспечение образовательного процесса «Методика организации и проведения уроков обобщения и систематизации знаний» (Методическая разработка) ... 217

**Гарный А.А.** Обеспечение учебной мотивации учащихся на уроках географии посредством применения системы практикоориентированных заданий ... 226

**Гелясин А.Е.** Формирование исследовательской компетентности обучающихся на факультативных занятиях по физике в условиях профильного обучения ... 231

**Герасимов В.Д.** Построение школьного курса математики для 1-6 классов на основе принципа системной дифференциации как важнейший ресурс инновационных технологий обучения ... 241

**Гетманова О.Г.** Система работы по подготовке учащихся к конкурсу исследовательских работ ... 247

**Гимбут В.В.** Работа по организации поисково-исследовательской деятельности учащихся на второй и третьей ступенях общего среднего образования ... 256

**Гин С.И.** Авторское учебно-методическое сопровождение обучения учащихся с высоким уровнем учебной мотивации на I ступени общего среднего образования ... 262

**Гладченко Р.А.** Возможности поликультурной образовательной среды при моделировании уроков физики, астрономии ... 266

**Голік А.А.** Медыяадукацыя і развіццё чытацкай пісьменнасці на вучэбных занятках па беларускай мове і літаратуры ... 269

**Гончаренко И.Н.** Формирование и развитие исследовательских умений учащихся в организации образовательного процесса по математике ... 272

**Гордеев Э.Ю.** Личностно-профессиональное развитие учителя на основе анализа индивидуального педагогического опыта ........ 278

**Горовая Л.С.** Формирование и развитие профессионального мастерства педагогов в условиях учреждения образования........ 286

**Громова С.А.** Ритмодекламация как средство комплексного развития учащихся на уроке музыки........ 293

**Гуринович О.А.** Сетевое взаимодействие как форма обобщения и распространения положительного педагогического опыта........ 297

**Гуркова М.В.** Рефлексия педагогической деятельности учителя иностранного языка: самоанализ и анализ учебного занятия по иностранному языку ........ 306

**Данченко В.А.** Медиатексты на уроках русской литературы: практика использования........ 312

**Дёмина Е.А.** Поиск как условие творчества на уроках обучения чтению и письму в первом классе........ 316

**Дземішкан В.І.** Краязнаўчы праект як сродак фарміравання грамадзянскай самасвядомасці і сацыяльнай актыўнасці вучняў........ 320

**Дервоед Л.И.** Формирование опыта самостоятельной учебной деятельности учащихся через систему очно-дистанционных заданий по географии ........ 325

**Дамасевіч В.А.** Выкарыстанне тэхналогіі рознаўзроўневага навучання ў рухомых групах для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы........ 331

**Дробышевская В.З.** Программа формирования гуманистической культуры детско-родительских отношений «Родители и дети: любовь, забота, ответственность»........ 337

**Дрозд О.Д.** Использование системы поурочного контроля как средства повышения учебно-познавательной мотивации учащихся 5-8 классов на учебных занятиях по русскому языку........ 345

**Дроздова Е.Л.** Личностно-профессиональное развитие учителя на основе анализа индивидуального педагогического опыта «Сервисы Web 2.0 как средство активизации познавательной деятельности на уроках английского языка»........ 353

**Другакова А.А.** Выкарыстанне інтэрактыўнай дошкі на ўроках беларускай мовы для фарміравання і развіцця арфаграфічнай пісьменнасці вучняў........ 359

**Дубко А.Л.** Выкарыстанне інтэрактыўных метадаў і прыёмаў на ўроках беларускай мовы ў 5-8 класах як сродку актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў........ 364

**Дубков С.Г.** Самореализация педагогических работников как неотъемлемое условие профессионального роста ........ 370

**Дуброва А.В.** Использование языковых игр в процессе формирования языковой компетенции учащихся при обучении английскому языку на первой ступени общего среднего образования ........ 374

**Дударева М.М.** Проектная деятельность на уроках истории как средство формирования ключевых компетенций учащихся ........ 383

**Дударенкова Е.А.** SWOT-АНАЛИЗ как метод ведения инновационной деятельности педагога ........ 392

**Евжик Е.И.** Использование нестандартных задач для формирования опыта творческой деятельности учащихся второй ступени общего среднего образования на уроках математики ........ 396

**Егорова Т.В.** Организация подготовки учащихся к научно-практическим конференциям ........ 402

**Еремич Е.А.** Формирование сукцессивных функций у обучающихся с моторной алалией посредством использования электронного тренажера «Обучай-ка» ........ 409

**Ерошенко М.В.** Использование дифференцированных тестовых заданий как средства обучения и текущего контроля на уроках химии ........ 414

**Жалевич Г.К.** Методическое сопровождение эффективного педагогического опыта в учебно-педагогическом комплексе ........ 420

**Жамойтар А.В.** Использование информационно-коммуникативных технологий на уроках «Человек и мир» и «Литературное чтение» в начальной школе ........ 426

**Жук В.В.** Использование интерактивных приёмов обучения на уроках английского языка для развития умений говорения на II ступени общего среднего образования ........ 435

**Загорская И.Л.** Взаимодействие с родителями в учреждении дошкольного образования средствами информационно-коммуникационных технологий ........ 440

**Зайцев И.С.** Вопросы подготовки и повышения квалификации педагогических кадров ........ 445

**Залыгина Н.А.** Направления поддержки освоения педагогами практики воспитательной работы ........ 451

**Запрудскі М.І.** Прэзентацыя вопыту на кваліфікацыйным экзамене на вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю ........ 456

**Заремская Л.И.** Личностное развитие учителя и учащихся при педагогическом взаимодействии на занятиях объединения по интересам ........ 461

**Захарова К.В.** Патриотическое воспитание учащихся с трудностями в обучении посредством компьютерных игр ........ 464

**Заяц Е.А.** Виртуальный кабинет учителей иностранного языка как средство распространения эффективного педагогического опыта ........ 470

**Зинович А.А., Райко Д.Н.** Применение эмоционально-ценностного подхода на уроках истории ........ 474

